**СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫ СКАЗ**, складаная сінтаксічная адзінка, прэдыкатыўныя часткі якой звязаны злучальнай сувяззю, рэалізаванай праз ужыванне злучальных злучнікаў і злучальных слоў. Злучальныя злучнікі з'яўляюцца асноўным граматычным паказчыкам складаназлучаных сказаў. Сэнсавае адзінства складаназлучаных сказаў ствараецца таксама з дапамогай інтанацыі, парадку размяшчэння частак і суадносін трывальна-часавых форм дзеясловаў-выказнікаў: *А сняжынкі сеюць кволую імглістасць, падаюць бялюткі за маім акном, і цвіце на вішнях снежная ўрачыстасць, сцелецца на скронях перад ранім сном* (П. Трус); *Я музыку складаў, а ў вышыні так ціхаспеўна, мякка і шчымліва трымцелі сінязорныя агні* (М. Шабовіч). Злучальная сувязь частак складаназлучаных сказаў прадвызначае іх сінтаксічную раўнапраўнасць. З сэнсавага боку прэдыкатыўныя часткі складаназлучаных сказаў могуць быць як самастойнымі, так і ўзаемаабумоўленымі. Адносна самастойнымі выступаюць сказы, для якіх характэрна аўтасемантычнасць, інакш кажучы, кожная частка такіх сказаў можа функцыянаваць як асобны сказ: *Якая дарога цяжкая на сотні і тысячы вёрст! То дождж вадаспадам сцякае, то снег да асфальту прымёрз* (П. Панчанка); *І спынілі галінку лясы пад празрыстым святлом месяцовым, і аселі купінкі росы на кустах і на травах мядовых* (А. Астрэйка). Прэдыкатыўныя часткі такіх сказаў слаба залежаць адна ад другой, паколькі парадак размяшчэння іх можа быць зменены. Аднак якой бы слабай ні была сувязь паміж часткамі такіх сказаў, яны ўсё роўна не могуць быць незалежнымі і самастойнымі. Сэнсавыя адносіны паміж кампанентамі складаназлучаных сказаў, у якіх магчыма перастаноўка частак, у пэўнай ступені падобныя да адносін паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі злучнікам *і*. У навукова-метадычнай літаратуры такія сказы адносяць да сказаў адкрытай структуры.

Узаемаабумоўленымі выступаюць складаназлучаныя сказы, для якіх характэрна сінсемантычнасць, г. зн., што кожная частка такіх сказаў не можа функцыянаваць як асобны сказ і не дапускае ў сваім складзе перастаноўкі частак: *Рака даўно адступіла ад берага, памялела, але тут, на заломе, глыбіні яшчэ хапае метраў на чатыры* (А. Кудравец). Немагчымасць перастаноўкі частак у такіх сказах абумоўлена сэнсавым зместам, а таксама тым, што наступная частка будуецца ў залежнасці ад папярэдняй. Канструкцыйная і граматычная абумоўленасць другой часткі праяўляецца ў парадку слоў, у наяўнасці ў яе складзе займеннікаў і займеннікавых прыслоўяў, якія замяняюць члены першай часткі, у пропуску некаторых членаў: *Гукам аргана нібы цесна было ў іх урачыстым і велічным узлёце, і яны вырываліся, вылятаі на плошчу, будзячы ў сэрцах рэдкіх прахожых розныя пачуцці* (М. Лынькоў); *Было бяскрайняе зорнае неба, а пад ім – спакойная і цёплая вада, таксама без канца і краю* (Я. Брыль). Першая частка складаназлучаных сказаў са злучнікам больш самастойная ў граматычных адносінах, але і яна не можа лічыцца абсалютна незалежнай і закончанай. У навуковай літаратуры такія сказы адносяць да сказаў закрытай структуры (гл. **ТЫПЫ СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫХ СКАЗАЎ**).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прэдыкатыўныя часткі складаназлучаных сказаў нагадваюць сабой простыя сказы рознай структуры – двухсастаўныя і аднасастаўныя, развітыя і неразвітыя, поўныя і няпоўныя. У межах складаназлучанага сказа часткі могуць быць аднолькавай структуры, г. зн., быць аднатыпнымі (толькі двухсастаўнымі ці толькі аднасастаўнымі), а могуць быць і разнатыпнымі (адна частка двухсастаўная, а другая – аднасастаўная, адна – няўскладненая, другая – ускладненая): *Вакол затокі раслі кусты, і нізкі бераг быў выслізганы мокрымі нагамі…* (А. Жук); *На шляху былі густыя зараслі, і лось, ломячы іх, рынуўся напрасткі…* (М. Чарот); *Хацелася маўчаць, і я маўчаў пад песню ў задуме* (Я. Брыль).

Сродкамі сувязі частак складаназлучанага сказа выступаюць злучальныя злучнікі, якія ў лінваметадычных дапаможніках і граматыках падзяляюцца на 4 асноўныя групы: 1) спалучальныя злучнікі (*і, ды*); 2) супастаўляльныя (або супраціўныя) злучнікі (*але, а, ды* (*у значэнні але*), *затое, ж* (*жа*), *аднак, толькі*); 3) пералічальна-размеркавальныя злучнікі (*ці, або, і – і, ні – ні, то – то, ці – ці, не то – не то, ці то – ці то, або -- або*); 4) далучальныя злучнікі ці злучнікі, якія ўжываюцца ў далучальным значэнні (*ды і, а то* і інш.); а таксама злучальныя словы (*потым, затым, пасля*): *Вячэрняя зара дагарала на захадзе, і водбліскі яе адлюстроўваліся на воднай роўнядзі далёкіх сажалак* (А. Чарнышэвіч); *Палешукі стаялі, як строгія і справядлівыя суддзі, але сур'ёзныя твары іх часта рабіліся вясёлымі* (Я. Колас); *Спіць Парфен, галаву кажушком накрыўшы. Не то будзіць яго, не то не будзіць* (М. Лобан); *Не ў тыя рукі каса трапіла, ды і касіць у такую пару цяжка* (М. Воранаў); *Усярэдзіне нешта абарвалася, пасля яна, Наста, неяк аблякла ўся* (І. Пташнікаў). Дадатковымі сродкамі сувязі частак у складаназлучаным сказах з'яўляюцца: інтанацыя, парадак размяшчэння частак, трывальна-часавыя формы дзеясловаў-выказнікаў і іншыя лексіка-граматычныя адзінкі.

*С.С.Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ